# СПЕЦЫФІКА ВЫРАШЭННЯ ЭКЗІСТЭНЦЫЙНАГА КАНФЛІКТУ Ў ТВОРАХ Ж. П. САРТРА І В. БЫКАВА

**М. І. Дзікун**

*Беларускі дзяржаўны універсітэт, г. Мінск;*
*maria.dikun02@gmail.com*
*навук. кір. – У. Ю. Верына, канд. філал. навук, дац.*

У артыкуле разглядаюцца асаблівасці вырашэння экзістэнцыйнага канфлікту ў творах Ж. П. Сартра і В. Быкава. Матэрыялам паслужылі аднайменныя апавяданні французскага і беларускага пісьменнікаў – «Le mur» / «Сьцяна». Створаныя адпаведна ў 1939 г. і ў 1997 г., гэтыя апавяданні засяроджаны на падобным коле праблем і маюць структурнае падабенства: мастацкую прастору, абагуленага героя, сімвалічнасць. Экзістэнцыйны канфлікт абодвух твораў складае праблема існавання ў безвыходнай сітуацыі. Вырашэнне гэтага канфлікту выразна адрознівае пазіцыі аўтараў. Ж. П. Сартр у адпаведнасці з філасофскай праграмай экзістэнцыялізму прапануе прыняцце сітуацыі і ўсведамленне марнасці ўсіх дзеянняў у сувязі з непазбежнай канчатковай смяротнасцю. В. Быкаў падкрэслівае неабходнасць асобы мужна змагацца з лёсам.

***Ключавыя словы:*** экзістэнцыйны канфлікт; экзістэнцыялістская літаратура; экзістэнцыяльная літаратура.

У XX ст. экзістэнцыялізм стаў, як шмат стагоддзяў таму хрысціянства на апошніх хвілінах існавання Рымскай імперыі, глытком свежага паветра ў душным свеце. Ён пакідаў чалавеку галоўнае – права на самастойны выбар – гэта і падарунак, і праклён чалавецтва. Філасофія экзістэнцыялізму набывае асаблівую актуальнасць у крызісныя эпохі, калі чалавеку асабліва важна зрабіць пэўны выбар, знайсці апраўданне для свайго быцця. Мастацкая літаратура XX ст. адгукалася менавіта на такія праблемы – складаныя, жыццёва неабходныя, таму часам вельмі шчыльна зрастаўлялася з філасофіяй, у прыватнасці з экзістэнцыялізмам. Але і сам філасофскі кірунак распрацоўваўся ў сувязі з літаратурнай творчасцю, у прыватнасці ў французскай галіне: філасофскія погляды адлюстравалі ў літаратурных творах Ж. П. Сартр, А. Камю, С. дэ Бавуар. Экзістэнцыйная праблематыка ўласціва і літаратуры ўвогуле, таму даследчыкі адрозніваюць літаратуру экзістэнцыялісцкую ад літаратуры экзістэнцыяльнай (Ю. У. Камінская). Блізкая праблематыка выклікае падабенства вобразнасці, нават сюжэтных схем, якія пісьменнікі выкарыстоўваюць у сваіх творах. Мы разгледзім адну такую пару твораў, якія ўзніклі ў розных нацыянальных традыцыях і ў розны час, але само іх падабенства і адрозненне нараджаюць цікавыя, на наш погляд, высновы.

Апавяданні Жана-Поля Сартра «Мур» і Васіля Быкава «Сьцяна» не раз рабіліся аб’ектам параўнальнага аналізу. Такое параўнанне прапаноўваецца ў школе ў якасці дадатковага задання [1], але нашай мэтай будзе паглыбленне ў адрозненне, якое палягае ў вырашэнні экзістэнцыяльнага канфлікту двума пісьменнікамі.

Е. А. Лявонава ў серыі артыкулаў «Творчасць Васіля Быкава і Жана Поля Сартра праз прызму традыцыі Дастаеўскага: філасофска-эстэтычныя перасячэнні» адзначае зварот В. Быкава да экзістэнцыялісцкай літаратуры як відавочны. Сярод агульных рысаў паэтыкі апавяданняў «Мур» Ж.-П. Сартра і «Сьцяна» В. Быкава даследчыца адзначае наступныя: абагуленасць сюжэтнай калізіі, галоўнага героя, сімвалічнасць, трансгістарычнасць, месца дзеяння, абсурднасць намаганняў героеў [2].

Зразумела, што «Мур» Сартра – навэла, напісаная менавіта для таго, каб увасобіць у мастацтве асноўныя пастулаты экзістэнцыялізму. Наадварот, «Сьцяна» Быкава – самастойная навэла-прытча, якая адказвае на адначасова агульна-быццёвыя і нацыянальныя пытанні. Яна завяршае і дае назву кнізе апавяданняў 1997 г. [3].

Аб’ект разважання ў абедзвюх «Сьценах» адзіны – чалавек у пагранічных абставінах, асаблівасці змянення яго стану; затое шлях вырашэння канфлікта – прынцыпова розны. Так, герой Сартра робіць выбар на карысць бяздзейнасці, бо задача пісьменніка – паказаць, што чалавек не можа перамагчы свой лёс, асабліва калі ўсвядоміў сваю смяротнасць. Вядомы тэолаг Поль Цыліх пісаў: «У экзістэнцыялізме не існуе шляху пераадольвання пагрозы. Адзінае магчымае стаўленне да яе – мужнасць прыняць яе на сябе». У быкаўскай «Сьцяне» да мужнасці дадаецца наяўнасць мэты жыцця і надзея. Трэба змагацца, пераадольваць сцены і рухацца наперад.

Пісьменніцкі стыль Сартра адпавядае французскай школе: простыя канструкцыі, эканомія мастацкіх сродкаў, празрыстая фабула. Гіпербалізаваная неэмацыйнасць, адчужанасць герояў ілюструюць аддаленасць асобы ад знешняга свету, немажлівасць пераадолець бар’ер паміж светам і сабой. Сартра цікавіць фізіялагічны стан асобы ў пагранічнай сітуацыі. Наадварот, Васіль Быкаў апісвае героя звонку: беларуская «Сьцяна» пазбаўлена натуралістычнасці, аўтар накіраваны на аналіз псіхалагічнага стану. Мова навэлы таксама простая, але аўтар захоўвае класічны, уласцівы сябе стыль: лірычныя адступленні цесна звязаны з сюжэтам, каб зразумець ідэю, трэба расшыфраваць загадкі-сімвалы. Таму жанр навэлы паступова пераходзіць у жанр прытчы, што стала адметнай рысай сталага Быкава.

Адно з відавочных адрозненняў паміж творамі Сартра і Быкава звязана з дзеючымі асобамі. Акрамя невялічкіх момантаў, Безыменны, герой Быкава, заўсёды адзін, затое сутарэнні сартраўскай навэлы запаўняюць героі розных нацыянальнасцей, узростаў, характараў і як сацыяльных, так і псіхалагічных станаў. На іх прыкладах паказаны розныя ступені ўсведамлення чалавекам непазбежнасці смерці і абсурднасці жыцця.

Маральная аснова творчасці Сартра і Быкава супадае: «дзейнічай адпаведна сумленню». Цікава, што ў гэтай філасофіі Бог не фігуруе. Чалавек застаецца адзін, права выбару дазваляе яму самастойна прымаць пэўныя рашэнні, але гэта свабода выбару засноўваецца на ўнутраных абмежаваннях. На першы погляд, «Сьцяна» Сартра – аповед пра Грамадзянскую вайну 1936–1939 гадоў у Гішпаніі. Але вайна выконвае сімвалічную ролю: з’яўляецца дэкарацыяй, у якой прасцей за ўсё паставіць героя ў пагранічнае становішча. Тое ж самае ў «Сьцяне» Быкава. Краіна, у якой «дыктатары… не выводзіліся ніколі», тыповая турма, чарговы чалавек, канешне, нагадваюць савецкія рэаліі, але адмысловы стыль прытчы служыць доказам абстрактнасці тэксту.

Фінал застаецца адкрытым. Безыменны быкаўскі герой пераадольвае адну сцяну, але апынаецца перад шыбеніцай. Быкаў сцвярджае: выйсця няма, але жыццё не пазбаўлена сэнсу: гэта цыклічнае паўтарэнне разбурэння сцяны, увасоблены міф пра антычнага Сізіфа. Сэнс, па Быкаву, у вечнай барацьбе, у вечным дзеянні, у тым, каб пераадольваць сябе. Сартр жа сцвярджае абсурднасць жыцця, яго супярэчлівасць і жорсткасць. Пабла застаецца жывы фізічна, але мёртвы духоўна, ён істэрычна смяецца: не ў яго сілах разыграць лёс, жыццё заўсёды будзе адвернута ад чалавека.

Асабліва часта сімвалы выкарыстоўваюцца ў мастацкай літаратуры не толькі як аб’ёмныя ў культурна-кантэкстуальным значэнні вобразы, але як сродак сувязі паміж пісьменнікамі. Так, на аснове вобраза сцяны будуецца своеасаблівы дыялог культур, нацыянальных поглядаў Сартра і Быкава. Па-першае, канешне, сцяна – гэта несвабода, заключэнне. Абодва пісьменнікі выкарыстоўваюць прыём рэалізаванай метафары: абстрактнае паняцце няволі пераўтвараецца ў матэрыяльна абазначаны прэдмет – мур. Але канкрэтны мастацкі час удакладняе сімвал сцяны, звужае яго: гэта абазначэнне ціскоў таталітарнай сістэмы, ваяўнічай палітыкі дваццатага стагоддзя. Па-другое, сцяна – бар’ер паміж чалавекам і чалавекам, адзінота кожнай асобы, няздольнасць зразумець адзін аднаго. Аднак для Сартра тут важна і тое, што сцяна – мяжа паміж светам жывых і мёртвых. Ён сцвярджае, што жыццё не належыць чалавеку, таму нянавісць Пабла можна патлумачыць так: ён адчувае

мяжу паміж сабой і тымі, хто яшчэ не зразумеў абсурднасць жыцця, хто не страціў надзею. Зусім па-іншаму ставіцца да людзей быкаўскі Безыменны. Чалавек, які прыносіць яму ежу, нясе на сваім целе пах свабоды і ўзмацняе прагу жыць, калупаць сцяну і змагацца. Быкаўская сцяна адрозніваецца ад сартраўскага мура тым, што яе магчыма разбурыць.

Галоўны канфлікт сартраўскаай навэлы не знешні, а менавіта ўнутраны: супярэчнасці ў душы чалавека, неразуменне самога сябе. На пытанне, ці можа чалавек зразумець свой унутраны свет, Сартр дае адмоўны адказ. У Быкава, як нам падаецца, такая праблема не паўстае. Такім чынам, сцяна, па Сартру, з’яўляецца сімвалам яго канфлікта з лёсам, грамадствам і самім сабой. Быкаў жа настойвае, што карані, маральныя каштоўнасці і сіла волі фарміруюць цэласную асобу, здольную змагацца з жорсткім і несправядлівым лёсам.

Філосаф Сёрэн К’еркегор лічыў неабходным прапанаваць формулу «пілюлі для дваццатага стагоддзя». Нягледзячы на супярэчлівасць поглядаў розных яго прадстаўнікоў, экзістэнцыялзм, па сутнасці, з’яўляецца запатрабаванай філасофскай сістэмай, галоўнае значэнне якой для грамадства ў ажыўленні мысліцельнага апарату, запыленага стагоддзем рацыяналізму і аптымістычнай веры ў магчымасць пазнання свету. З пункту гледжання французскіх экзістэнцыялістаў, катэгарычнае адмаўленне ад буржуазных каштоўнасцей вяртае чалавецтва ў лона цывілізацыі – антычную культуру (адсюль міф пра Сізіфа, які стаў таксама асновай праграмнага эсэ А. Камю 1936 г.); захоўвае мараль, працягваючы рэлігійную філасофію І. Канта, Ф. Дастаеўскага; дае чалавеку надзею. Безумоўна, чалавек дваццатага стагоддзя, на думку Ж. П. Сартра і В. Быкава, сільны духоўна, адказны і годны, але адзінокі і незразуметы. У XXI ст. сітуацыя амаль што не змянілася: жыццё ў сённяшнім грамадстве патрабуе ад чалавека знешняй стойкасці і нават жорсткасці, пры гэтым сцяна, якая прапаноўвае прытрымлівацца дыстанцыі, прымушае чалавека замыкацца ў адзіноце. Больш за тое, праблема паступовай страты каранёў паграджае беларускай нацыі. Менавіта таму літаратура філасофскай накіраванасці застаецца актуальнай: яна дае магчымасць нібы збоку ўбачыць уласнае жыццё.

**Бібліяграфічныя спасылкі:**


1. *Верціхоўская М. І.* Урокі літаратуры ў старшых класах : вучэб.-метад. дапам. Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2011.
2. *Лявонава Е. А.* Беларуская літаратура XX ст. у еўрапейскім літаратурным кантэксце: вуч. дапам. Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2002.
3. *Быкаў В. В.* Сьцяна. Мінск : Наша Ніва, 1997.
4. *Сартр Ж. П.* Мур. Мінск : Мастацкая літаратура, 1991.